— Не понимаю я сегодняшнюю жизнь. Мне не понятно, откуда деньги у тех, кто катит на «Мерседесе»? Почему их не ловит милиция, КГБ, отделы по борьбе с экономическими преступлениями, прокурор и т. д. И что это за стройки на дачах, куда едут одна за другой машины со стройматериалами, где работает государственная техника — краны, экскаваторы, бульдозеры? Кто же встанет на защиту людей, живущих честным трудом, неспособных к воровству и к надувательству? Почему государство в лице Верховного Совета, Совета Министров полностью выпустило из своих рук контроль? Когда будет приватизация, то те, кто половчее, понаглее и поближе к «кормушке», захватят самые лакомые куски, а мне останется несколько кирпичин из заводской трубы. На мой взгляд, Шушкевич и Кебич толковые мужики, а вот их «команды» не внушают доверия. Читал, что есть список из 2000 высокопоставленных и помельче взяточников-чиновников. Почему его не публикуют? Что касается партий, то их много, а толку мало.

Александр Григорьевич Прадед, фрезеровщик отдела механизации и автоматизации завода «Транзистор».

— Что касается меня, то сессии Верховного Совета и политические дискуссии ничего, кроме зевоты, не вызывают. Когда были выборы, то кандидаты в депутаты много чего обещали рабочим, а что в итоге? Сейчас все: и одежда, и обувь, и питание, и транспорт — стало дорогим удовольствием. Как же быть рабочему классу? Вновь поднимать булыжник против новых эксплуататоров? На новые выборы, которые будут в 1994 году, не пойду. Снова будут красивые обещания, снова будут дурачить людей. Пришел к твердому выводу, что у власти стоят дурачье и жулье.

Артур Иванович Попкович, газоэлектросварщик цеха N 28 завода «РЭМ».

— Поотрывать бы головы тем чиновникам, которые бросили рабочих в пучину хаоса. Никто о них не думает — ни высшее начальство, ни низшее... В повестке сессии Верховного Совета Республики Беларусь нет ни одного проекта закона об улучшении жизни «гегемона». Обсуждаются все больше законы о гимне, таможне, прокуратуре, банках, пенсии военным, торговом обслуживании и т. п. Напрочь забыли законодатели о тех, кто создает богатства республики. Среди тех, кто руководит промышленностью, есть такие, кто ни одного дня не проработал на заводе. У меня, как и у многих моих товарищей, нет веры в наше правительство. Если будут выборы, то вместо одних проходимцев придут другие.

Сергей Михайлович Родненок, слесарь цеха N 44 машиностроительного комплекса.

— Кто виноват в том, что все мы уже буквально не просто лежим на борту, а тонем? Почему полные сил труженики не могут заработать себе на жизнь? Почему реформы превращают человека труда в нищего? Уж не за счет ли людей труда возникла однопроцентная прослойка богачей? Самое прямое отношение к этому имеют Верховный Совет, Совмин, разные министерства и ведомства. У рабочего класса вопрос о языках никогда не стоял и не стоит. Это все народные фронты разводят болтовню о языках — чей лучше, стараются поссорить трех родных братьев — русского, украинца и белоруса. Мы, рабочие, никакого облегчения от действий парламента не видим. А Шушкевичу и Кебичу надо найти мужество поменять свои команды, очиститься от взяточников и лихоимцев. Лучшая партия, на мой взгляд, анархическая, но ее так очернили, что ее почти не слышно.

Конечно, четыре мнения — это не голос всего рабочего класса, но политикам призадуматься нужно. От того, за кого проголосуют люди труда на будущих выборах, зависит итог предвыборной кампании.

Вячеслав ИЩЕНКО

ЗАКОН АБ ЗЯМЛІ. КАБ НЕ НАШКОДЗІЦЬ

«Чаму гарадскія людзі, ад сельскай гаспадаркі вельмі далёкія, вырашаюць пытанні аб зямлі? Чаму не спытаюць селяніна, які на той зямлі працуе і таксама мае на яе законнае права?» — былі ледзь ці не першыя словы, што давялося мне пачуць ў калгасеімя Калініна Мінскага раёна. Праект Закона «Аб уласнасці на зямлю» у сваім апошнім варыянце наўрад ці вырашыць праблемы айчыннай сельскай гаспадаркі. Больш рэальна адваротнае: захаванне дзвюх форм уласнасці, дзяржаўнай і прыватнай, на думку многіх сялян, — прамы шлях да разбурэння сучаснай вёскі.

Мікалай Іванавіч Піткевіч і Сцяпан Аляксеевіч Мелянчук ужо не першае дзесяцігодзе працуюць у калгасе імя Калініна. Абодва — члены ПНЗ. Іх меркаванні наконт «гарачай» праблемы — пэўнае адлюстраванне таго настрою, з якім успрынялі калгаснікі рэспублікі новы праект закона аб зямлі.

С. А. Мелянчук: Дзесьці наверсе вырашылі, што самы час ліквідаваць калгасы. Маўляў, калектыўныя гаспадаркі даўно ўжо нерэнтабельныя і сваё аджылі. Але хіба ж па ўласным жаданні апынуліся мы ў такіх умовах? Ад калгасніка зараз мала што залежыць, бо цэны дыктуюць зверху. Сельскагаспадарчая прадукцыя параўнаўча з мінулым уздаражала ў 12 разоў. А цэны на мінеральныя ўгнаенні, трактары і іншую тэхніку, без якой не абысціся, узляцелі аж у 50 разоў! Чаму такая розніца?.. Зарплату нашу таксама фантастычнай не назавеш. Больш за ўсіх атрымліваюць трактарысты — 6 800 рублёў. Вадзіцелі — 6 тысяч, даяркі — 5 700, паляводы — наогул чатыры з паловай тысячы... Зараз літаральна ўсе калгаснікі жывуць за мяжой беднасці. А цэны такія, што амаль ніводная гаспадарка сябе не апраўдвае. А вось стаць фермерам сёння не ўсялякі калгаснік рызыкне. Бо ў іх становішча яшчэ горшае. Калі калгасы ды саўгасы яшчэ карыстаюцца якой-ніякай дзяржаўнай дапамогай, то фермеры ўвогуле кінутыя на волю лёсу. Параўнайце: за літр малака калгаснік атрымлівае прыкладна 30 рублёў. Фермер — толькі 14. За мяса ад 179 да 210 рублёў — і 149 рублёў адпаведна... У Старым Сяле ёсць адзін «гаспадар», над якім рэспубліканскі аграпрам узяў шэфства, адбудаваў яму ферму — дык гэта паказуха, не болей.

М. І. Піткевіч: Кіламетраў восемь — дзесяць адсюль ёсць фермерскія гаспадаркі, але хіба толькі спачуванне яны і могуць выклікаць. Ёсць у мяне там знаёмы. Чалавек узяў зямлю, купіў трактар «Беларусь», пасеяў жыта, грэчку і траву. Жыта і грэчку потым прадаў за бясцэнак у падсобную гаспадарку. А зараз не ведае, як разлічыцца з дзяржавай, выплаціць пазыку... Усё яшчэ не выпрацаваны талковы механізм развіцця структуры фермерскіх гаспадарак, і вельмі многія фермеры адмаўляюцца ад сваёй «самастойнасці», бо не могуць выжыць у такіх умовах.

С. А. Мелянчук: Калі зараз усіх адразу зрабіць прыватнікамі — дзяржава наўрад ці будзе сытай. Хіба што «заграніца нам дапаможа».Але ж мы цапкам можам абысціся і без закупак збожжа за мяжой. Калі б земляроб атрымліваў за свой хлеб столькі, колькі мы плацім за імпартнае збожжа, ды яшчэ ў валюце — хапіла б і айчынных запасаў накарміць рэспубліку. А долары лепш патраціць на сучасную сельскагаспадарчую тэхніку.

М. І. Піткевіч: Ёсць яшчэ іншая небяспека. Вось у нас, напрыклад, 480 гектараў пашы — і падзелім мы іх на 400 чалавек рабочых, на ўсіх пароўну. А нейкі там алкаголік, якому гэтая зямля ніколі і не была патрэбна, возьме ды прадасць яе якой-небудзь фірме. Магчыма, нават замежнай. Так мы згубім сваю зямлю!

С. А. Мелянчук: Сам я з Маларыцкага раёна, што ў Брэсцкай вобласці. Калі ствараліся калгасы, у 49-м годзе мне было чатырнаццаць. Я вельмі добра памятаю сваю «дакалгасную» вёску. Не скажу, што сяляне жылі блага. Сярэдне жылі. Мелі прыкладна па 10 гектараў зямлі. Але пэўныя зберажэнні былі толькі ў тых, хто меў 100 і больш гектараў. Атрымай мы зараз кожны сваю долю — і застанемся жабракамі. Апрацоўваць зямлю чым? — Нечым. Цэны на тэхніку ведаеце якія? Няма гаруча-змазачных матэрыялаў — дзе ўзяць? І далей, калі мне, прыватніку, дзяржава не дапаможа, не арганізуе продаж маёй прадукцыі — банкруцтва непазбежнае... Не спрачаюся, прыватная гаспадарка — вялікая справа, за ёй будучае. Я першы абедзвюма рукамі падтрымліваю гэтую ідэю. Чалавек працуе сам на сябе, бачыць вынікі ўласнай працы, зарабляе адпаведна патрачаным сілам — гэта вельмі добра. Але зараз такое магчыма толькі тэарэтычна. Сёння ж мае сэнс бадай што асацыяцыя роўных партнёраў, няхай сабе і прыватнікаў, але — асацыяцыя...

М. І. Піткевіч: А на самой справе — той жа калгас. Калектыўныя гаспадаркі не апраўдваюць сябе — дык правядзіце рэформу. Калгас, створаны, напрыклад, на акцыянерных пачатках, будзе дастаткова жыццяздольным. Навошта разганяць гаспадаркі, якія на працягу многіх гадоў паказалі сябе не толькі з горшага боку? Да чаго можа прывесці непрадуманая паспешлівасць — прыкладаў хапае. Узяць хоць нашых суседзяў, прыбалтаў. Хіба вучыцца на ўласных памылках — лепшае выйсце з тупіковай сітуацыі? Не думаю.

Так разважаюць людзі, чый лёс напрамую залежыць ад таго, да якога рашэння прыйдуць дэпутаты. Колькі форм уласнасці будзе ў нас — дзве, тры? Не памыліцца б.

Запісала І. ЗАВАДСКАЯ

НА ПАЛІТЫЧНЫМ НЕБАСХІЛЕ

ХТО ЗА ПАЛІТЫЧНЫ РЭВАНШ?

Сённяшні госць «Звязды» — вядомы беларускі палітолаг, член выканкома Партыі народнай згоды Леанід Лойка. Тэма гутаркі — апошнія падзеі на Беларусі і, у прыватнасці, аднаўленне дзейнасці КПБ. Да жнівеньскіх падзей 1991 года Л. Лойка працаваў выкладчыкам у мінскай Вышэйшай партыйнай школе, але быў вядомы як прыхільнік рэформ у краіне і дэмакратызацыі КПБ.

— Леанід Вікенцьевіч, як сёння вы ацэньваеце тое, што адбываецца ў камуністычным руху Беларусі?

— Адмена пастановы Вярхоўнага Савета аб прыпыненні дзейнасці КПБ унесла значныя папраўкі ў маральна-палітычны клімат рэспублікі. Сотні тысяч былых членаў партыі могуць нарэшце пазбавіцца ад адчування таго, што нехта робіць іх без віны вінаватымі. Абвінавачванні за адно толькі членства ў партыі ўспрымаліся многімі як асабістая абраза. Усё гэта давялося перажыць. Што датычыць сённяшняга становішча ў КПБ, то яна ў тым выглядзе, як мы яе ведаем, не мае гістарычнай перспектывы. За дзесяцігоддзі свайго ўладарання яна не змагла забяспечыць народу Беларусі ні заможнасці, ні больш-менш годнага жыцця. Апошнія кіраўнікі КПБ Я. Сакалоў, А. Малафееў, А. Камай і іншыя не выпраўлялі памылак сваіх папярэднікаў, а і надалей імкнуліся ператварыць Беларусь у запаведнік таталітарнай сістэмы. І ў многім ім гэта ўдалося. Сваёй няўклюднай, антыдэмакратычнай палітыкай набліжалі крах партыі. І зусім дарэмна цяпер яны імкнуцца прыкрыцца «здрадай» апошняга генсека ці дэпутатаў-камуністаў, якія прагаласавалі за забарону КПБ. Менавіта яны самі, ператварыўшы ў фарс апошні, XXXI з'езд КПБ, запраграміравалі яе бясслаўны канец. Таму дзіўным здаюцца захады былых праваднікоў, якія спрабуюць зрабіць выгляд і нават даказаць грамадскасці, што КПБ пасля адпачынку зноў бярэцца за працу.

— Вы, як нам вядома, з'явіліся адным з ініцыятараў стварэння ў свой час новай арганізацыі — Партыі народнай згоды. Як вам і вашым калегам бачацца сёння адносіны паміж ПНЗ і КПБ?

— Многія з членаў ПНЗ заставаліся ў радах КПБ да той хвіліны, пакуль не згасла апошняя надзея, што гэтая партыя не зможа рэфармавацца і накіраваць сваю дзейнасць у імя інтарэсаў народа Беларусі. Каб спрыяць гэтаму, мы спачатку вялі агітацыйную работу ў партыйных структурах, потым спрабавалі стварыць дэмакратычную фракцыю ўнутры КПБ, і толькі калі ўсё гэта не дало вынікаў, было аб'яўлена аб стварэнні новай партыі. Што датычыць узаемаадносін паміж ПНЗ і КПБ на сённяшнім этапе, то аб іх казаць цяжка, бо КПБ існуе пакуль толькі фармальна, практычных яе крокаў не відаць.

— Вы ўзгадалі спробу стварэння фракцыі ў КПБ. Наколькі гэта было сур'ёзна і рэальна?

— Канешне, разбіць ідэалагічны і арганізацыйны жалезабетон кампартыі было справай нялегкай. Многія пачыналі з таго, што дамагаліся хоць нейкай палітычнай культуры, свабоды, права на асабістую думку. Але пасля некалькіх сутычак з партапаратам і няўдалых спроб аб'яднацца яны выходзілі з КПБ. Адна з такіх спроб адбылася вясной 1991 года, калі ў парткоме завода імя Арджанікідзе пачаў працаваць гурток, у састаў якога ўваходзілі сакратары парткомаў буйнейшых прадпрыемстваў Мінска, а таксама гісторыкі і палітолагі з ВПШ і Белдзяржуніверсітэта. Абмяркоўваліся пытанні рэфармавання ідэалогіі партыі. Гэта не было нейкай змовай. Але далёка справа не пайшла: недзе месяцы праз два, калі стала немагчымым вытрымліваць націск з боку абкома, хлопцы выйшлі з гульні. А найбольш сур'ёзнай стала апошняя акцыя ў Вярхоўным Савеце, дзе была створана дэпутацкая фракцыя «Камуністы за дэмакратыю». У ліпені 1991 года завязаліся кантакты паміж дэпутатамі і групай мінскай інтэлігенцыі, якія дамовіліся аб сумесных дзеяннях па стварэнню рэфарматарскай фракцыі ў самой КПБ. Але жнівеньскія падзеі апярэдзілі нас. Тады быў узяты курс на стварэнне новай партыі — ПНЗ.

— А калі б камуністы раптам прынялі сёння тую праграму, якую ваша група выпрацавала два гады назад, вы вярнуліся б у КПБ?

— Няма ніякіх падстаў чакаць ад завадатараў камуністычнага рэнесансу на Беларусі пераходу на пазіцыі цвярозага сэнсу. Для мяне асабіста стварэнне ПНЗ і ёсць рэформа партыі. І калі зараз узнікне такая камуністычная арганізацыя, якую можна бало б назваць дэмакратычнай і патрыятычнай, то я агітаваў бы за збліжэнне ПНЗ з ёй.

— А як вам бачацца адносіны вашай партыі з Партыяй камуністаў Беларусі?

— З'яўленне ў свой час на палітычнай арэне ПКБ нікога, здаецца, не здзівіла. Прыхільнікі ідэі ўсеагульнай роўнасці былі, ёсць і будуць у кожным грамадстве. У ПКБ сабраліся ў асноўным людзі старэйшага ўзросту, якім у сённяшніх жорсткіх сацыяльна-эканамічных умовах нічога не застаецца, як патрабаваць сацыяльнай абароны. І ў гэтай частцы палітыкі ПКБ мы салідарныя з ёй. А калі мы шукаем выйсце з крызісу, шляхі далейшага развіцця грамадства, погляды гэтай партыі здаюцца нам устарэлымі і ўтапічнымі.

Да таго ж відавочныя намаганні вярхушкі КПБ падпарадкаваць сабе і новыя, і старыя камуністычныя арганізацыі. Калі гэта ім удасца, то мы будзем мець справу з партыяй палітычнага рэваншу. Менавіта з гэтага боку можна будзе чакаць эскалацыі палітычнай напружанасці.

«Звязда», 18.03.93 г.

ОБРАЗОВАНИЕ ПОЛИТИКЕ НЕ ПОМЕХА

СКВОЗЬ ПРИЗМУ ЕВРОПЕЙСКОГО ОПЫТА

По нашей шкале ценностей образование все еще занимает одно из последних мест в структуре общественных и политических отношений. Хотя на самом деле это место «краеугольного камня», что пока не понимаем мы, но хорошо осознанно в странах Западной Европы.

Конференция, организованная Датским комитетом независимых школ и аналогичным Европейским советом, которая состоялась в начале февраля в Копенгагене, так и называлась: «Школа как краеугольный камень демократического общества». Ее участникам, в числе которых была и группа из Беларуси, конференция дала уникальную возможность увидеть и почувствовать изнутри один из фрагментов процесса европейской интеграции, явления настолько же впечатляющего, насколько и неоднозначного. Не случайно в суждениях наших западных коллег наряду с вполне обоснованным удовлетворением достигнутым звучали и нотки нескрываемой тревоги, ощущения уже позабытого ими в благополучии последних лет. Образ объединяющегося континента предстал перед нами не в виде традиционного набора теленовостей, а живых людей, столкнувшихся с историей на своих рабочих местах.

ИХ ПРОБЛЕМЫ

«Десять веков потратил средневековый Запад, чтобы сделать выбор между стоявшими перед ним альтернативами: замкнутая экономика или открытая, жизнь в одной общей цитадели или в разных самостоятельных домах», — отмечал выдающийся французский историк Ж. Легофф. И вот сегодня эти альтернативы вновь возникли перед европейским Западом, а их «второе пришествие» оказалось для Старого Света довольно внезапным. История Европы последних десятилетий отмечалась исключительным динамизмом: «бунтовские» 60-е, технологические 70-е, напряжение холодной войны, резкий порыв «ветра перемен» с Востока и, наконец, сумерки отдельной государственности перед лицом континентального подхода.

Эти изменения в основе, конечно, трансевропейские, принесли и свои проблемы. Дело в том, что трудности, возникавшие в ходе развития, разрешались в каждом из «самостоятельных домов» в соответствии с их внутренним укладом, в первую очередь посредством государственных мер. Это еще более усилило их оригинальность, неповторимость, а следовательно и государственную же особенность. Но одновременно расширялись, углублялись связи, перерастая в интеграционный процесс. За эти годы у каждой страны скопилось свое «домашнее» достояние, упакованное в государственные рамки, судьба которого теперь в «общей цитадели» не очень ясна.

Бурная динамика последних трех десятилетий неожиданно поставила и проблему смены поколений. Те, кому сейчас всего лишь около пятидесяти, оказались едва ли не в положении поколения пенсионеров. Половина их жизни буквально пронеслась в бешеном ритме, заданном тем фантастическим временем, которое они ностальгически называют «сикетиз» (60-е). И вот это движение вдруг привело к совершенно новой ситуации, когда привычные рамки государства растворяются в более сложном «континентальном» объединении. Поколение, сотворившее за пару десятилетий в Европе то, на что до них уходило несколько жизней, ждет рейса в будущее Европы, не зная, примут ли его на борт с его багажом. Или хотя бы с частью багажа.

По идее, для выхода из таких ситуаций нужно еще одно поколение, как это было в годы их юности, когда старики деголевского возраста просто и спокойно ушли на покой. Но им отнюдь не восемьдесят и им еще рано уходить. С другой стороны, современное молодое поколение, выбравшее «пепси», в отличие от шестидесятников, выглядит мало озабоченным проблемами исторических прорывов и вообще вряд ли способно к действиям подобного масштаба.

ИНТЕГРАЦИЯ И РЕФОРМА ОБРАЗОВАНИЯ

Это уже прямо подводит нас к проблеме образования как она, на мой взгляд, стоит в сегодняшней Европе.

Развитые государства континента, осуществив в 70-е — 80- е годы широкое обновление своих образовательных систем, вновь стали перед необходимостью их реформирования. Замкнутые на уклад и потребности своих стран, они теперь трансформированы в контексте европейской интеграции. И тут же обнаружились острейшие проблемы. Политики и педагоги с тревогой констатируют опасные тенденции среди молодежи: либо к пассивному самоустранению от перенапряженной и запрограммированной культурной и социально-экономической жизни, либо к агрессивному варварскому отрицанию цивилизации вообще, граничащему с фашизмом.

Все это подводит европейцев к определенным решениям, о которых и шла речь на конференции в Копенгагене. Одной из исходных посылок здесь служит вывод экспертов, что объединение Европы — явление далеко не только политическое. И потому логичной видится попытка при трансформации системы образования выйти за пределы сугубо государственного мышления. Традиция последнего, однако, настолько сильна, что для обозначения принципиально иных не политических феноменов и понятий в образовательной среде пользуются абсолютно политическим термином «демократия», стремясь одновременно придать ему расширенную трактовку.

Отталкиваясь от понимания демократии в сфере экономики и политики, западные ученые выделяют еще один, скрытый ее план, который предполагает определенный способ видения устройства человеческой жизни во всех ее проявлениях. В соответствии с этим в датской образовательной теории демократия определяется прежде всего как господствующий в обществе тип самоопределения, возникший, по преданию, в утлой лодке викингов. Суть же его в том, что каждый на своем месте делает только то, что требует от него именно это место, но делает с такой мерой ответственности, как будто кроме его работы на Земле больше ничего не существует. Задача же тех, кто управляет, сводится к установке рамок для осуществления каждой из таких работ.

Вся система датского образования построена в соответствии с этим принципом и нацелена на выработку именно такого способа отношения к миру.

ДАТСКАЯ МОДЕЛЬ

Структура образования как административная, так и учебная представляет собой сплошную систему рамок, вкладывающихся одна в другую, но в каждой из которых есть место для свободного действия. В частности, государство, исправно финансируя абсолютно все, в том числе и так называемые частные школы, практически не вмешивается в учебный процесс. Оно даже не имеет права закрыть школу, если ее ученики плохо сдают экзамены. Этим правом обладают школьные родительские комитеты. Но если уровень обучения устраивает родителей, они ни в коем случае не станут вмешиваться в деятельность школьной администрации и тем более учителей.

Содержание же образования построено так, чтобы научить ученика самому добывать знания, свободно с ними обращаться как с инструментом получения новых знаний, самостоятельно выходить на конечный результат. Датский учитель значительно меньше озабочен содержанием своего предмета (он может вести их несколько) — он выступает как организатор работ и взаимодействия на уроке.

Это, в сущности, и есть датская попытка заложить краеугольный камень под здание демократии духа.

Вторая тенденция, продолжающая первую, состоит в пересмотре места и статуса образования в системе учреждений и структур. Незыблемая казалось бы традиция, включающая школу в систему социально-политического истеблишмента, подвергается очень серьезному переосмыслению. Особое внимание уделяется независимым школам, влияние которых быстро растет (в той же Дании государственная школьная система плавно перенимает схему организации независимых школ).

При этом независимое образование отделяется не только от государственного, но и от элитарного частного, оно противопоставляется любой образовательной системе, ориентированной на то, чтобы уже с детства включить человека в ту или иную социально-политическую систему. Есть только одна сила, оказывающая влияние на независимые школы, — это родители. Возможность выбора родителями той или иной философии образования, а значит и философии жизни вплоть до инициативы создания новой школы — такова главная цель системы независимых школ. Тенденция к полному выделению образования в самостоятельный универсум, формирующий базовую структуру цивилизации, находит свое отражение в финансовой сфере. Ту часть взимаемой с родителей платы, которая идет на образовательные нужды, предполагается заменить системой ваучерной платы, когда каждая школа должна будет содержать себя за счет средств, привлекаемых через продажу школьных ваучеров родителям.

НОВАЯ КОНЦЕПЦИЯ ОБРАЗОВАНИЯ

Несмотря на то, что цели и рамки образования в новой Европе еще далеко не отчетливы, а для решения клубка очень сложных проблем в принципе отсутствует метод, в области образования, тем не менее, осуществляются конкретные и действенные меры. Это стало возможным потому, что найден правильный подход к образовательной проблематике. Образование — не способ включения человека в ту или иную социальную или политическую машину. Тем более — это не место для необоснованных экспериментов над природой человека, его духовным «я». Оно есть канал передачи цивилизации от поколения к поколению. Понятие «родительский выбор» в этом смысле не случайно — именно просто люди, родители своих детей, являются ее носителями...

Происходящее сейчас в Европе не имеет прецедентов как по типу возникающих проблем, так и по их напряженности, возникшей в результате сверхдинамичного развития культурно-исторического пласта и молниеносного распада одного из самых могущественных государств планеты. Хотя, конечно же, проблемы Западной Европы существенно отличаются от проблем, встающих перед Европой Восточной. Но одно у них общее — ни там, ни здесь нет готового шаблона для их решения.

Хотелось бы подчеркнуть — перспективы развития образования в Европе открывают еще одну возможность интеграции и нашей республики в европейское сообщество. Фактически, это открытая дверь, освобождающая нас от хлопот по прорубанию очередного окна. И хотя то, что находится за этой дверью, неведомо нам так же, как и европейцам, это не может служить основанием для того, чтобы ею не воспользоваться. Образовательное движение — шанс развернуть реальное сотрудничество в совместной проработке общих перспектив, преодолев, хотя бы на одном участке, традиционное отставание.

Сергей КОРОЛЬ

ГДЕ ЖЕ ВЫ, ОПТИМИСТЫ?

Лишь около трети населения Украины и Беларуси смогло ощутить на себе благотворный характер производимых экономических реформ и извлечь из них пользу. Остальная часть жителей этих бывших союзных республик считает себя в проигрыше и испытывает ностальгию по прошлым «застойным временам».

К такому выводу пришли эксперты австрийского Общества Пауля Лацарсфельда на основании социологического опроса, проведенного в конце прошлого года на Украине и в Беларуси двумя авторитетными институтами по изучению общественного мнения — институтом Фесселя и институтом «Минтропа».

Из данных опроса следует, что около 75 процентов украинцев и белорусов не отказались бы от реставрации плановой экономики. Поборниками нынешней системы экономического развития в Беларуси выступают 15, а на Украине — всего 4 процента населения. Кстати, в государствах Центральной и Восточной Европы — бывших соцстранах — доля сторонников плановой экономики составляет в среднем 50 процентов. А главное отличие между жителями бывших союзных республик и их соседями из бывшего соцлагеря заключается в том, что 73 процента восточноевропейцев убеждены, что по крайней мере через пять лет в их экономике произойдут перемены к лучшему, доля оптимистов среди украинцев и белорусов едва превышает 40 процентов.

Весьма схожая картина вырисовывается и в политической сфере. Так, 61 процент жителей Беларуси и 54 — граждан Украины дают позитивную оценку прежним временам «господства коммунистов», 48 процентов белорусов и 53 украинцев — отвергают систему плюрализма и демократии, и лишь соответственно 35 и 27 процентов граждан обеих республик выступают в ее поддержку. Политическое будущее своих стран оценивают лишь около половины украинцев и белорусов, тогда как в Центральной и Восточной Европе этот показатель достигает более 80 процентов.

ИТАР — ТАСС

Прапануем вашай увазе раздзел з кнігі Адама Станкевіча «Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення», якая была выдадзена ў Вільні ў 1935 годзе. Яе аўтар — рэлігійны і палітычны дзеяч, гісторык і філосаф — разважае пра акт 25 сакавіка 1918 года. Спадзяёмся, што з думкамі і меркаваннямі аднаго з дзеячаў беларускага нацыянальнага і рэлігійнага адраджэння будзе цікава пазнаёміцца і нашым сучаснікам.

Некалькі слоў аб Адаме Вікенцьевічу Станкевічу. Нарадзіўся ён у вёсцы Арляняты Ашмянскага павета 24 снежня 1891 года ў сялянскай сям'і. Ужо ў юнацкія гады стаў карэспандэнтам газеты «Наша ніва». Скончыў духоўную каталіцкую семінарыю ў Вільні, а затым Пецярбургскую духоўную каталіцкую акадэмію. У час вучобы ў Пецярбургу быў адным з стваральнікаў палітычнай партыі — Беларускай хрысціянскай дэмакратыі. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года ён у Мінску, адзін з арганізатараў беларускага хрысціянска-дэмакратычнага руху. З 1922 года ён жыве і працуе ў Вільні, з'яўляецца паслом польскага сейма, рэдагуе беларускую газету «Хрысціянская думка». А дома Станкевіч аўтар прац аб Вітаўце Вялікім, Скарыне, Каліноўскім, Эпімах-Шыпілу, беларускім нацыянальна-вызваленчым і рэлігійным руху. Напрыклад, такія яго кнігі, як «Хрысціянства і беларускі народ» (Вільня, 1940) і «Беларускі хрысціянскі рух» (Вільня, 1939) не страцілі сваёй актуальнасці і сёння.

У гады другой сусветнай вайны ён актыўна ўдзельнічаў у беларускім палітычным руху, быў праціўнікам супрацоўніцтва з нямецкімі акупантамі.

У снежні 1944 года А. Станкевіча арыштавалі органы НКДБ, але ў хуткім часе вызвалілі. 13 красавіка 1949 года ён быў ізноў арыштаваны. Асобай нарадай пры МДБ СССР 31 жніўня 1949 года асуджаны на 25 гадоў турэмнага зняволення і накіраваны ў Тайшэтлаг. 4 снежня 1949 года ён памёр у канцлагеры і пахаваны на могілках каля вёскі Шаўчэнка Тайшэцкага раёна.

Так скончыў свой жыццёвы шлях адзін з вялікамучанікаў беларускай нацыянальнай ідэі.

Раздзел з кнігі друкуецца на мове арыгінала.

Уладзімір МІХНЮК, прафесар

АКТ 25 САКАВІКА 1918 ГОДА

З Рады Зьезду і Выканаўчага К-ту Зьезду, як мы ўжо бачылі ў сакавіку месяцы 1918 г. утварылася Рада Беларускай Народнай Рэспублікі. Была яна як-бы беларускім парлямэнтам, бел. законадаўчай установай. Выканаўчым органам Рады БНР, ці прасьцей кажучы — Беларускім Урадам, і далей аж да 23.VII.18 г. быў народны Сакратарыят, у склад якога ўваходзіла нешта да 15 народных сакрэтароў, ці міністраў.

Вось жа Рада БНР разам з сваімі міністрамі, будучы ў нязвычайна цяжкім палажэньні, з апошніх выбіваючыся сіл, энэргічна праводзіла далей дзяржаўна-незалежніцкую ідэю, стараючыся зрэалізаваць яе.

Тымчасам справа гэта была нялёгкая. Немцы і бальшавікі дзялілі Беларусь. У Берасьці 9.II.18 быў падпісаны дагавор між немцамі і ўкраінцамі, на моцы якога некаторыя беларускія паветы пераходзілі да Украіны.

Немцы прызнавалі незалежнасьць Літвы, у склад якой так-жа мелі ўвайсьці некаторыя беларускія землі. Прыступалі так-жа немцы да ствараньня «незалежнай» Курляндыі, да якой далучыліся-б беларускія землі Віцебшчыны. Але гэта ўсё дробныя кавалкі беларускай зямлі, якой гандлявалі немцы. Бальшавікі-ж для немцаў тым-жа беларускім коштам былі шмат шчадрэйшыя.

3.III.18 прадстаўнікамі расейскай бальшавіцкай улады быў падпісаны мірны дагавор з немцамі, на моцы каторага «землі, ляжачыя на захад ад лініі Рыга — Дзьвінск — Сьвянцяны — Ліда — Пружаны ня будуць больш падлягаць дзяржаўнаму сувэрэнітэту Расеі і будучы лёс гэтых зямель уладзіць Нямеччына з Аўстро-Вэнгрыяй, на моцы згоды з іх насельніцтвам».

Такім чынам жывое цела Беларусі ў сакавіку 1918 г. было падзелена на часьці прадстаўнікамі тэй улады, каторая ў сьнежні 1917 г. разагнала Усебеларускі Зьезд. Выйшла так, што бальшавікі сілай перашкодзілі беларусам бараніць і будаваць Беларусь, а пасьля самі падзяліліся ёй з Нямеччынай. Мала гэтага, пункт IX Берасьцейскага дагавору кажа, што: «абедзьве староны, якія між сабой мірацца (Нямеччына і Расея) адказваюцца ўзаемна ад тых убыткаў, каторыя прычыніла вайна насельніцтву гэтых дзяржаў». І гэты пункт маскоўскія бальшавікі падпісалі ў вялікай меры на кошт беларускага народу, бо-ж усім ведама, колькі Беларусь ад вайны пацярпела!..

Ясная рэч, што Рада Беларускай Народнай Рэспублікі і яе ўрад не маглі згадзіцца з тым, што Берасьцейскі дагавор абавязвае беларускі народ. Трэба было пратэставаць, трэба было прад усім сьветам заявіць, што аковаў, прыгатаваных для Беларусі бальшавікамі і нямецкімі гэнэраламі, яна дабравольна сабе не наложа і ад прыгавору на сябе сьмерці адказваецца. Сьвяты загад, які даў свайму выканаўчаму органу Усебеларускі Зьезд: «бараніць Беларусь ад разьдзелаў», трэба было споўніць, ня гледзячы на ніякія перашкоды.

Тымчасам выканаць гэты загад у тых варунках міжнароднага характару, у якіх знаходзілася Беларусь, было немагчыма. Справа ў тым, што згодна з міжнародным правам, дагаворы, падпісаныя ўрадам усяго краю, ня могуць не прызнавацца паасобнымі яго часьцямі. Дзеля гэтага БНР, покуль яна афіцыяльна не заявіла аб сваей дзяржаўнай сувэрэннай незалежнасьці, была ўважана за часьць Расеі і дзеля гэтага мусіла маўчаць і прызнаваць тое, што рабілі бальшавіцкія камісары. Аставалася адно з двух: або адхіліцца ад наказу Усебеларускага Зьезду і згадзіцца на новую палітычную сьмерць Беларусі, або аб'явіць Беларусь ад нікога незалежнай сувэрэннай дзяржавай і гэтым ўратаваць будучыню беларускага народу. Рада, як убачым ніжэй, стала на гэты другі шлях.

Як успаміналі мы вышэй, пачынаючы ад Усебеларускага Зьезду, сярод беларускіх палітыкаў ужо паяўлялася думка аб ідэале незалежнасьці Беларусі. Падзел Беларусі ў Берасьці 3.III.18 думку гэту яшчэ больш усіліў і зактулізаваў. Слушна кажа праф. У. Ігнатоўскі, што ў гэтым часе «думка аб незалежнасьці Беларусі ад Савецкай Расеі менскім беларускім кругом не давала спаць».

Думка аб абвешчаньні беларускай поўнай незалежнасці цалком насьпела і сталася канечнасьцяй, калі беларусы з Зах. Беларусі з пад нямецкай акупацыі пачалі спатыкацца з беларусамі Усх. Беларусі. Беларусам з усходу трудна было парваць дзяржаўную лучнасьць з Расеяй; беларусам віленскім зрабіць гэта было зусім лёгка, бо фактычна гэтага даканала нямецкая акупацыя. Бел. Канфэрэнцыя ў Вільні 15 — 17.I.1918, як мы бачылі, дамагаючыся Беларуска-Літоўскай дзяржавы з зямель з пад нямецкай акупацыі, дамагалася, каб да гэтай дзяржавы была далучана і рэшта беларускіх зямель, што на ўсход ад лініі гэнай акупацыі. «Конфэрэнцыя горача жадае, каб у імя права на непадзельнасьць беларускага народу, разрэзанага лініяй фронту і ў імя еднасьці ўсіх беларуска-літоўскіх зямель — да памянёнай гасударственнай арганізацыі, заўсёды станавіўшай ядро Вялік. Кн. Літоўскага, была далучана і рэшта беларускіх зямель, як часьць да цэлага»...

Віленская Рада, выбраная на ўспомненай Канфэрэнцыі, на паседжаньні сваім 19.II.18 прыняла пастанову між іншым гэткага зместу ...«Віленская Беларуская Рада абвяшчае сувязь паміж Расеяй і Беларусяй парванай... Рада зьвяртаецца да ўсіх заходніх дзяржаў... каб яны дапамаглі ў справе адбудовы дзяржаўнай незалежнасьці колішняга Літоўска-Беларускага гаспадарства... ня гледзячы на цяперашні разьдзел яго мяжою фронту».

Характэрнае, як бачым, было стварыўшыся палажэньне ў беларускай тагочаснай палітыцы. Менскія беларусы, якім, як кажа Ігнатоўскі, думка аб незалежнасці Беларусі ад Расеі не давала спаць, ніяк не маглі адважыцца выявіць яе фармальна і афіцыяльна. Узноў-жа віленскія беларусы, фактычна будучы ад Расеі адарваны праз некалькі гадоў, незалежнасьць Беларусі ад Расеі аб'явілі афіцыяльна, але й далей гаварылі не аб Беларусі сувэрэннай, збудаванай на беларускім нацыянальным прынцыпе, а аб Літоўска-Беларускай дзяржаве, аб супольным дзяржаўным арганізме беларусаў і літоўцаў. І гэта было тады, як мы ўжо ўспаміналі, калі літоўцы, уцяміўшы глыбей ад беларусаў нацыянальны прынцып, ужо былі далёка зайшоўшы ў будаваньні цалком самастойнай незалежнай Літвы, аб супалцы з беларусамі ня хочучы слухаць. Такім чынам бачым, што агулам у тагочаснай беларускай палітычна-дзяржаўнай думцы, як у Беларусі заходняй, так і ўсходняй, не хапала скоордынаваньня, супольнай плятформы выключна на нацыянальным прынцыпе і супольнага ад усей Беларусі фармальнага выступленьня ў справе поўнай самастойнасьці і незалежнасьці Беларусі.

Урэшце сталася і гэта. У другой палове сакавіка 1918 г. у Менск прыбыла дэлегацыя ад Віленскай Беларускай Рады. Віленчукі, спаткаўшыся з мінчукамі, хутка выбыліся сваіх неактуальных фэдэрацыйных ідэалаў з Літвой, а ўзноў мінчукі яшчэ больш набраліся рашучасці і пракананьня аб патрэбе абвешчаньня незалежнасьці Беларусі і ўжо на гэтым грунце далейшага вядзеньня беларускага палітычнага вызваленьня. Словам, ідэя сувэрэннай Беларусі насьпела цалком. Аставалася толькі яе выявіць. БНР папоўнілася прадстаўніцтвам ад Вільні. У БНР была выразная большасьць незалежнікаў, якая на паседжаньні Рады БНР у ночы з 24 на 25.III.1918 прыняла рэзалюцыю аб сувэрэннай незалежнасьці Беларусі.

Беларусь пачала новую эру. Таго-ж самага дня была апублікована ад імя Рады БНР наступная — трэцяя — устаўная грамата:

«Год таму назад народы Беларусі, разам з народамі Расеі, скінулі ярмо расейскага царызму, якое найцяжэй з усіх прыдушыла Беларусь; не пытаючыся народаў, ён кінуў наш край у пажар вайны, якая дашчэнту зруйнавала гарады і вёскі беларускія. Цяпер мы, рада БНР, скідаем з роднага краю апошняе ярмо дзяржаўнай залежнасьці, якая была накінута расейскім царызмам на наш вольны і незалежны край.

Ад гэтага часу Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчаецца незалежнай і вольнай дзяржавай. Самі народы Беларусі, у асобе свайго Устаноўчага сойму, пастановяць аб будучых дзяржаўных зьвязях Беларусі.

На падставе гэтага траціць сілу ўсе старыя дзяржаўныя зьвязі, якія далі магчымасьць чужому ўраду падпісаць і за Беларусь Трактат у Берасьці, што забівае на сьмерць беларускі народ, дзелячы зямлю яго на часткі. На падставе гэтага Урад Бел. Нар. Рэспублікі мае ўвайсьці ў зносіны з зацікаўленымі старанамі, запрапанаваўшы ім перагледзець тую частку Берасьцейскага трактату, якая датычыць Беларусі і падпісаць мірную ўмову са ўсімі ваяваўшымі дзяржавамі.

БНР павінна абняць усе землі, дзе жыве і мае лічэбную перавагу беларускі народ, а ўласьне: Магілёўшчыну, беларускія часьці Меншчыны, Віленшчыны, Гродзеншчыны, Вітэбшчыны, Смаленшчыны, Чарнігаўшчыны і сумежныя часьці суседніх губэрняў, заселеных беларусамі.

БНР пацьвярджае ўсе тыя правы і вольнасьці грамадзян і народаў Беларусі, якія абвешчаны Устаўнай Граматай ад 9-га сакавіка 1918 г.

Абвяшчаючы аб Незалежнасьці БНР, яе Рада ўскладае свае надзеі на тое, што ўсе, любячыя волю народы, памогуць беларускаму народу ў поўнай меры зьдзейсьніць яго палітычна-дзяржаўныя ідэалы. 25 сакавіка 1918. Менск. Рада БНР».

У гэткіх цяжкіх натугах і болях нарадзіўся ідэал незалежнай сувэрэннай нацыянальнай Беларусі.

Кто только нынче не грешит на прогнозы: политики и политологи, философы и социологи, экстрасенсы и астрологи, публицисты и ясновидящие.
Им верят и не верят, но пусть и вполуха, вполглаза, с усмешкой и иронией, все же слушают и читают. Оно и понятно: жизнь трудная и тревожная. И так хочется заглянуть за горизонт, узнать, что день грядущий нам готовит. Несет ли утешение и облегчение? Или чем дальше, тем страшнее?
И вот еще один прогноз. Политический, что обычно. Но неземного происхождения, что необычно. Он передан из высшего тонкого мира. Записан Галиной Григорьевной Козловой, кандидатом биологических наук, ведущим научным сотрудником НИИ прикладных физических проблем, которая заглянула к нам в редакцию и поделилась информацией. А мы делимся с вами. А уж верить или нет — дело личное.

ХОТИТЕ ВЕРЬТЕ, ХОТИТЕ — НЕТ

ПОЛИТИЧЕСКИЙ ПРОГНОЗ ИЗ КОСМОСА



— Галина Григорьевна, как давно Вы установили контакт с тем миром, который называете высшим, тонким?

— Года три назад. Вначале эпизодический к настоящему времени он перерос в устойчивую связь с информационным космическим полем: Земной Шамбалой, Орионом, Небесной Шамбалой, Огненным Миром. Контакт по типу связи Елены Рерих, то есть телепатический с записью.

— Не могли бы Вы назвать круг вопросов, по которым идет общение?

— Это вопросы по космическому пространству, жизни космоса, его беспредельности и роли человека в космосе, роли религии как связующего звена между высшими силами и человеком. Это вопросы жизни человека на земле сегодня и в ее возможной продленности в будущем, в том числе и социально-политической ситуации, в ее ближайшей перспективе.

— И что же там, за горизонтом? Предвидятся серьезные изменения? Какие и как скоро?

— Как сообщают внешние положительные космические силы, над горизонтом с Востока (Орион) уже поднимается Звезда. Все будет очень хорошо, хотя вначале и будет трудно. В промежуток с марта до конца августа развернутся процессы, которые приведут к самороспуску Верховного Совета и выборам нового. Произойдет смена правительства.

— Нынешние лидеры сохранятся?

— Нет, они уйдут с политической арены. Выборы выдвинут нового лидера, который сможет осуществить поворот к лучшей жизни.

Людям, которые ныне находятся у власти, космос рекомендует покинуть свои посты спокойно: «Вы не будете стоять у руля, — говорится в послании. — Жить спокойно, исправляя старательно ошибки прошлых лет, как можно больше творя хороших дел для человека — вот ваша задача на ближайшие годы. За эти три — пять лет вы успели много узнать, узнайте, как использовать эти знания на работе на благо людей».

— Ну что же, по крайне мере, мирный вариант смены власти. Что в более далекой перспективе?

— Согласно посланию из Небесной Шамбалы, принятой мною еще в конце прошлого года, с осени нынешнего года развернутся положительные процессы. К народу будут возвращаться духовность, язык, культура, мастерство, порядочность и доброта. По пути к расцвету пойдут искусство, наука. Но ценой напряженной созидательной работы и не в борьбе с ближними, а в согласии с ними.

— Такая идиллия? При сегодняшних-то раздорах, озлоблении.

— Нас предупреждают и о трудностях, о тяжелой судьбе для некоторых, особенно для тех, кто сознательно служит злу. Злу рекомендуют противостоять активно. «Щеку, — цитирую из послания, — можно подставить, чтобы решить — не ошибочен ли удар, но если выбивают зубы, надо отвечать».

— Видны ли из космоса наши партии? Каково их будущее?

— Пока поступили оценки самого общего характера: будущее за теми из партий, которые отвечают устремлениям сил Добра, отрицают методы насилия, делают упор на созидательную работу, на упрочение согласия между людьми во имя благих целей.

— Ну прямо о ПНС. А как с независимостью Беларуси? Есть перспективы, что из декларативной она станет реальной?

— Да, к 2000 году. Несмотря на сложности и трудности, будут развиваться процессы возрождения белорусского языка, культуры, духовности.

— Прогноз, переданный Вами, Галина Григорьевна, хорош не только своим утешительным смыслом, но и тем, что легко проверяем: осень не за горами. Ну, а в дальней перспективе, что ждет нашу замученную нами планету и ее безалаберных, грешных жителей?

— Земля сейчас выходит из отрицательной зоны космоса и переходит в положительную. Сегодняшние социальные потрясения — это последние вспышки ярости Дьявола, активизация сил зла, теряющих власть. Впереди восемь тысяч лет благополучия, процветания.

— Согласны наполовину. Искренне благодарны за беседу, за информацию.

РАЗНЫЕ РАЗНОСТИ

КОЕ-ЧТО О ПРЕСТУПНЫХ ВЛАСТЕЛИНАХ

Человеческая история полна кровавыми преступлениями «сильных мира сего». Они убивали своих матерей и отцов, братьев и сестер, детей и внуков, опасаясь за власть, трон. Часто казнили людей просто по личной прихоти, издевались над человеческим достоинством, устраивали массовый террор и геноцид. И нет числа их кровавым преступлениям!..

Так, Александр Македонский (356—323 гг. до н.э.) вырезал всех своих братьев, чтобы они не стали его соперниками за власть.

Убийцей родной матери из-за трона был царь Понта Митридат VI Евпатор (132—63 гг. до н.э.). Персидский царь Дарий II по той же причине сжег свою мать заживо (489 г. до н.э.).

Правитель Сасанидов (династия иранских шахов в 224—651 гг.) Ардашир I, имевший 30 сыновей, решил назначить своим наследником одного из них под именем Фраата IV. Последний затем умертвляет всех остальных своих братьев и своими же руками душит отца, чтобы не было претендентов на трон.

Турецкого султана Баязида II сверг и умертвил его сын Селим (1405 г.). Так же затем поступил и сын турецкого султана Ибрахима I.

Основатель государства Зулусов в Южной Африке Чака (1787 — 1829 гг.) твердо решил не иметь детей, чтобы наследники не стали его врагами. Однако смерть принял от коварного родного брата, устроившего заговор.

Турецкий султан Сулейман Великолепный (1520—1566 гг. правления) умертвил своего сына — наследника Мустафу. А чуть позже удавил и второго сына Баязида с его пятью малолетними детьми.

Германский властелин Людовик IV Баварский (1287—1347 гг.), услышав от своего министра финансов, что в казне нет денег на очередные королевские прихоти, приказал высечь его, а потом и выколоть ... глаза. А Бахрам I (из Сасанидов) приговорил к казни своего повара только за то, что тот случайно капнул соусом ему на руку.

Смерд Никитка смастерил крылья «аки птичьи». Надев на руки их, он выполнил несколько успешных полетов в присутствии Ивана IV и его свиты. Царь «отблагодарил» своего холопа, приказав: «Человек не птица, крыльев не имать. Аще же представит себе аки крылья деревянны, противу естеству творит. То не божье дело, а от нечистой силы. За сие содружество с нечистью отрубить выдумщику голову. А выдумку, аки дьявольскою помощью снаряженную, огнем сжечь». Можно еще добавить, что вся внутренняя политика Ивана IV сопровождалась массовыми опалами, казнями, усилением закрепощения крестьян.

Царь Алексей Михайлович (1629—1676 гг.) строго наказывал всех за курение табака. Например, за курение в первый раз он предусмотрел пытку и битье кнутом, вторично — вырывание ноздрей и обрезание носа.

Самовластье и жестокость Петра I Великого (правил с 1689 по 1725 г.) проявились в заточении в монастырь первой супруги и сестры Софьи, присутствии на пытке собственного сына царевича Алексея и гибели его, надругательстве над прахом князя И.М.Милославского, массовых казнях стрельцов. Реформы этого царя проводились жестокими средствами, путем крайнего напряжения материальных и людских сил, угнетения народных масс.

Иван ШПАДАРУК

Заснавальнікі:

Партыя народнай згоды, калектыў рэдакцыі.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не абавязкова супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.

Тэлефоны:
Леанід ЛОЙКА (рэдактар) — 32-35-94;
супрацоўнікі рэдакцыі:
Аляксей КАРОЛЬ — 32-01-84;
Ігар РЫЖКОЎ— 32-04-31.

Рэдакцыйная калегія

Наш адрас:
220041, Мінск, праспект Ф. Скарыны, 79.

Друкарня «Перамога», 222310, Маладзечна, вул. Таўлая, 11. Індэкс 63138, тыраж 7000 экз. Зак.